*А. В. Кахноўская*
Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі, Мінск

# ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ЭТНАКУЛЬТУРНАГА ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ ВА ЎМОВАХ ДАШКОЛЬНАЙ УСТАНОВЫ: КРЭАТЫЎНЫЯ ПАРАМЕТРЫ

*У артыкуле аналізуюцца праблемы дыягностыкі этнакультурнага выхавання дзіцяці старэйшага дашкольнага ўзросту ва ўмовах дашкольнай установы. На аснове распрацаванай мадэлі прасторы этнакультурнага выхавання, якая стваралася пасродкам абагачэння развіццёвага асяроддзя дзіцячага сада базавымі ўніверсаліямі культуры, даследуюцца асноўныя шляхі вывучэння эфектыўнасці далучэння старэйшых дашкольнікаў да этнічнай культуры беларусаў .*

*Diagnostic problems of ethnocultural children's upbringing at pre-school educational institution are analysed in the article. Based on developed (designed) model of ethnocultural upbringing environment that was represented by enrichment of pre-school educational institution stimulating environment by basic cultural universals, the author searches (analyzes) the main ways of learning the productivity of introduction children to the Belarusian culture.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Этнакультурнае выхаванне з'яўляецца адным з актуальных накірункаў у сучаснай сістэме адукацыі. Усё часцей у якасці прыярытэтных выступаюць задачы па далучэнні падрастаючага пакалення да народнай спадчыны, фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці не толькі дзяцей, але і дарослых.

Праведзены аналіз існуючых даследаванняў па вышэйзгаданай праблеме дазволіў канстатаваць адсутнасць базавай тэарэтыка-метадалагічнай асновы этнакультурнага выхавання, якая насіла б сістэмны характар. Так, многія даследчыкі, узяўшы за аснову ў этнакультурным выхаванні традыцыі, у якасці крытэрыю аналізу яго эфектыўнасці разглядаюць наяўнасць уяўленняў у дзяцей дашкольнага ўзросту пра нацыянальныя святы, абрады, магчымасць растлумачыць пэўны традыцыйны звычай, жаданне прымаць удзел у народных святах, а таксама кіравацца традыцыйнымі этнічнымі звычаямі ва ўласных паводзінах. Лінгвістычны падыход да этнакультурнага выхавання арыентуецца на моўнае развіццё дашкольнікаў (валоданне літаратурнымі нормамі і правіламі роднай мовы, наладжванне размовы ў адпаведнасці з канкрэтнай сітуацыяй, самастойнае састаўленне апавяданняў рознага віду і інш.). З пазіцыі аксіялагічнага падыходу ў якасці крытэрыю

аналізу этнакультурнай выхаванасці разглядаюць каштоўнасныя адносіны дашкольнікаў да сваіх родных, роднага краю, матэрыяльных прадметаў этнічнай культуры, уменне дзіцяці арыентавацца ў сваіх паводзінах на каштоўнасныя эталоны беларускага народа.

У адрозненне ад існуючых работ мы прапануем мадэль этнакультурнага выхавання старэйшых дашкольнікаў, якая заснавана не на адным элеменце этнакультуры, напрыклад, традыцыях, а на ўзаемасувязі асноўных базавых элементаў этнічнай культуры [3; 5; 7]. Такім чынам, мы арыентуемся на культуралагічны падыход да этнакультурнага выхавання дзіцяці ва ўмовах установы, якая забяспечвае атрыманне дашкольнай адукацыі. Прапануемы матэрыял прадстаўляе сабой завершаны аналіз мадэлі.

Паколькі ў даследаванні перад намі стаяла задача распрацаваць сістэмную мадэль этнакультурнага выхавання, апрабіраваць яе і вызначыць эфектыўнасць пасродкам адбору адпаведных крытэрыяў, за аснову мадэлявання прасторы этнакультурнага выхавання ўзяты прынцып абагачэння асяроддзя дашкольнай установы тыпаўтваральнымі прыкметамі этнакультуры (базавыя ўніверсаліі), прапанаваны доктарам філасофскіх навук, прафесарам В. У. Пазняковым [6, с. 80–93]. Сярод тыпаўтваральных прыкмет этнічнай культуры мы вызначылі аксіясферу, семіясферу, архетыпічна-міфалагічную сферу, суб'ектную сферу культурнага тыпу, дзейнасную сферу культуратворчасці, прадметную сферу, сферу трансляцыі і ўзнаўлення этнічнай культуры. Дадзеныя сферы ўласцівыя любой культуры пры пэўным зместавым напаўненні. Ва ўмовах установы, якая забяспечвае атрыманне дашкольнай адукацыі, вышэйзгаданыя сферы этнічнай культуры беларусаў можна вар'іраваць і ствараць такія выхоўваючыя асяроддзі, якія адпавядаюць патрэбам бацькоў, дзяцей, а таксама магчымасцям выхавальнікаў.

Такім чынам, актуальнасць і арыгінальнасць нашай работы абумоўлены своеасаблівасцю культуралагічнага падыходу, які заключаецца ў вылучэнні базавых універсалій этнічнай культуры. У якасці крытэрыяў аналізу этнакультурнай выхаванасці дашкольнікаў разглядаем этнічную культуру беларусаў як цэласную сістэму [2].

Адпаведна вышэйзгаданым базавым універсаліям (сферам) этнічнай культуры былі вызначаны асноўныя крытэрыі этнакультурнай выхаванасці дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту (табліца 1).

Вопытна-эксперыментальная работа праводзілася пад нашым кіраўніцтвам на базе Мінскай вобласці. Усяго ў эксперыменце прымалі ўдзел 315 выхаванцаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі (ДУА «Яслі-сад № 2 г. Дзяржынска» – 26 чалавек; ДУА «ДЦРД г. Дзяржынска» – 61 чалавек; ДУА «Яслі-сад № 2 г. Фаніпаль» – 51 чалавек; ДУА «Яслі-сад № 28 г. Барысава» – 40 чалавек; ДУА «Яслі-сад № 49 г. Барысава» – 50 чалавек; ДУА «Яслі-сад № 47 г. Барысава» – 51 чалавек; ДУА «Яслі-сад № 36 г. Барысава» – 36 чалавек). З іх 150 дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту – эксперыментальныя групы, 165 – кантрольныя.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Табліца 1*

**Крытэрыі ацэнкі эфектыўнасці мадэлі выхоўваючай прасторы этнакультурнага зместу**

| Сістэмаўтвараючыя сферы этнакультуры | Крытэрыі |
|---|---|
| 1. Суб'ектная сфера | Ідэнтыфікацыя дашкольнікаў у якасці носьбітаў этнакультуры |
| 2. Аксіялагічная сфера | Каштоўнасныя арыентацыі дашкольнікаў |
| 3. Семіятычная сфера | Валоданне семіятычнымі сістэмамі этнічнай культуры беларусаў |
| 4. Архетыпічна-міфалагічная сфера | Наяўнасць уяўленняў пра міфавобразы народнай культуры беларусаў |
| 5. Дзейнасная сфера культуратворчасці | Праяўленне этнакультурнай ідэнтыфікацыі ў дзейнасці |
| 6. Прадметная сфера | Этнакультурная семіятычная выражанасць прадметнага асяроддзя і веданне яго дзецьмі |
| 7. Сфера трансляцыі і ўзнаўлення | Наяўнасць уяўленняў пра асноўныя формы трансляцыі і ўзнаўлення этнакультуры |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Методыку даследавання мы распрацоўвалі з улікам тэарэтычных даследаванняў па этнакультурным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту, аўтарскай мадэлі выхоўваючай прасторы этнакультурнага зместу і псіхалагічных аспектаў развіцця дзіцяці старэйшага дашкольнага ўзросту.

Даследаванне было накіравана на вывучэнне эфектыўнасці распрацаванай намі сістэмнай мадэлі этнакультурнага выхавання пасродкам выяўлення асаблівасцей уяўленняў старэйшых дашкольнікаў аб асноўных структурных формах этнічнай культуры беларусаў, адносін да культуры і яе прадстаўнікоў.

Для рашэння дадзенай мэты былі выкарыстаны наступныя метады навукова-педагагічных даследаванняў:

- індывідуальныя гутаркі са старэйшымі дашкольнікамі пра этнічную культуру беларускага народа (яе складаючыя);
- назіранне за паводзінамі дзяцей у розных відах дзейнасці, як індывідуальнай, так і сумеснай з іншымі дзецьмі (гульнёвая, мастацкая, пазнавальна-практычная, зносіны і развіццё маўлення);
- эксперыментальныя сітуацыі з этнакультурнай накіраванасцю;
- вывучэнне прадуктаў культуратворчай дзіцячай дзейнасці (малюнкі, вырабы, аплікацыі і інш.).

Адметнасць абраных у даследаванні крытэрыяў ацэнкі эфектыўнасці мадэлі выхоўваючай прасторы этнакультурнага зместу заключалася ў крэатыўным характары іх выкарыстання. Аб гэтым сведчаць паказчыкі праяўлення этнакультурнай ідэнтыфікацыі старэйшых дашкольнікаў у дзейнасці. Сярод такіх паказчыкаў мы вызначылі самастойныя дыялогі дзяцей паміж сабой аб Беларусі і беларусах, свабодныя творчыя расказы

дашкольнікаў пра сваю нацыянальнасць, краіну, пра любімыя цацкі і народныя гульні, пра народныя святы і асаблівасці іх святкавання; перанос ведаў ад сферы зносін да мастацка-творчай, стварэнне культуратворчых прадуктаў (казкі, цацкі, маскі, самаробныя дэкаратыўныя вырабы і інш.), адлюстраванне этнічнага вобраза падчас драматызацый.

Вынікі эксперымента паказалі наступныя дадзеныя: пры параўнанні паказчыкаў пасля кантрольнага эксперымента адбыліся пэўныя пазітыўныя змены па адзначаным намі блоку (табліца 2).

*Табліца 2*

**Ідэнтыфікацыя старэйшых дашкольнікаў у якасці носьбітаў этнічнай культуры беларусаў**

| Узровень | Група | Абсл. | | % | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Канстатуючы этап | Выніковы этап | Канстатуючы этап | Выніковы этап |
| Высокі | ЭГ | 30 | 72 | 9,5 | 48 |
| | КГ | 13 | 46 | 4,1 | 28,9 |
| Сярэдні | ЭГ | 62 | 56 | 19,7 | 37,3 |
| | КГ | 81 | 87 | 25,7 | 54,7 |
| Нізкі | ЭГ | 58 | 22 | 18,4 | 14,7 |
| | КГ | 71 | 26 | 22,6 | 16,4 |

Назіранні за дзецьмі падчас правядзення інтэграваных заняткаў этнакультурнага зместу [1] паказалі, што дзеці ідэнтыфікавалі сябе са станоўчымі героямі этнічнай культуры, пры сумесных гутарках добразычліва ставіліся да прадстаўнікоў іншых культур, успрымалі іх з дабрынёй, жаданнем сябраваць і жыць у міры.

У выніку эксперыментальнай дзейнасці мы вызначылі, што дзеці сталі больш цікавіцца народным фальклорам: казкамі, заклічкамі, лічылкамі, загадкамі. Назіранне за дзіцячай дзейнасцю паказала, што дашкольнікі часцей выкарыстоўвалі ў гульнях прадметы беларускага побыту (сурвэткі, ручнікі, посуд), пераапраналіся для гульняў у нацыянальнае адзенне, якое знаходзілася ў кутках пераапранання, апраналі лялек у нацыянальныя касцюмы, з ахвотай слухалі беларускія песні, вершы, гулялі ў настольныя гульні з этнакультурнай накіраванасцю. Старэйшыя дашкольнікі ў гульнях ужывалі лічылкі, тэксты беларускіх вершаў, напрыклад: «...кот, кот, Апанас, ты шукай тры года нас...» і інш., разглядваючы малюнкі, цацкі, дзеці сталі ўжываць такія словы, як *цягнік, вавёрка, лялька, парасон* і інш., падчас назірання за надвор'ем – *чыстае паветра, ласкавае сонейка, моцны вецер* і інш.

Дадзеныя змены тлумачым выкарыстаннем абраных намі культураадпаведных формаў, метадаў і прыёмаў інтэграцыі старэйшых дашкольнікаў у развіццёвую прастору этнакультурнага зместу: заняткі комплекснаінтэграванага характару і эўрыстычныя гутаркі этнакультурнага накірунку, знаёмства дашкольнікаў з гісторыяй і прадстаўнікамі Беларусі праз нагляд-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ныя дапаможнікі, экскурсіі, развучванне песень, вершаў аб роднай краіне, далучэнне да культурных каштоўнасцей кожнай сям'і і інш. Абраныя намі формы, метады і прыёмы работы са старэйшымі дашкольнікамі былі накіраваны на творчае развіццё дзяцей, жаданне зацікавіць іх этнакультурным зместам, стварыць умовы для асобаснага развіцця кожнага дзіцяці, а таксама дарослага, які з ім супрацоўнічае [4].

Па астатніх блоках этнічнай культуры вызначыліся наступныя ўяўленні дашкольнікаў (табліца 3).

*Табліца 3*

**Уяўленні дашкольнікаў аб асноўных складаючых этнічнай культуры беларусаў**

| Блокі | | Група | Высокі ўзровень | | Сярэдні ўзровень | | Нізкі ўзровень | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Канстатуючы этап | Выніковы этап | Канстатуючы этап | Выніковы этап | Канстатуючы этап | Выніковы этап |
| | | | абсл. (%) | абсл. (%) | абсл. (%) | абсл. (%) | ябсл. (%) | абсл. (%) |
| Каштоўнасныя арыентацыі дашкольнікаў | | ЭГ | – | 29 (19,3) | 30 (20) | 84 (56) | 120 (80) | 37 (24,7) |
| | | КГ | 6 (3,6) | 7 (4,4) | 42 (25,5) | 111 (69,8) | 117 (70,9) | 41 (25,8) |
| Валоданне семіятычнымі сістэмамі этнічнай культуры | Родная прырода | ЭГ | 41 (27,3) | 91 (60,7) | 64 (42,7) | 45 (30) | 45 (30) | 14 (9,3) |
| | | КГ | 16 (9,7) | 59 (37,1) | 74 (44,8) | 83 (52,2) | 75 (45,5) | 17 (10,7) |
| | Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва | ЭГ | 23 (15,3) | 61 (40,7) | 59 (39,3) | 59 (39,3) | 68 (45,5) | 30 (20) |
| | | КГ | 17 (10,3) | 27 (17) | 79 (47,9) | 106 (66,7) | 69 (41,8) | 26 (16,3) |
| | Народнае адзенне | ЭГ | 13 (8,7) | 68 (45,3) | 73 (48,7) | 59 (39,3) | 64 (42,6) | 23 (15,4) |
| | | КГ | 20 (12,1) | 32 (20,1) | 66 (40) | 90 (56,6) | 79 (47,9) | 37 (23,3) |
| | Народная кухня | ЭГ | 12 (8) | 70 (46,7) | 75 (50) | 67 (44,7) | 63 (42) | 13 (8,7) |
| | | КГ | 9 (5,5) | 27 (17) | 81 (49) | 98 (61,6) | 75 (45,5) | 34 (21,4) |
| Валоданне асноўнымі формамі трансляцыі і ўзнаўлення, а таксама міфавобразамі этнакультуры | Народныя святы | ЭГ | 8 (5,3) | 62 (41,3) | 40 (26,7) | 67 (44,7) | 102 (68) | 21 (14) |
| | | КГ | 13 (7,9) | 52 (32,7) | 63 (38,2) | 77 (48,4) | 89 (53,9) | 30 (18,9) |
| | Народныя гульні | ЭГ | 23 (15,3) | 72 (48) | 71 (47,7) | 61 (40,7) | 56 (37,3) | 17 (11,3) |
| | | КГ | 11 (6,7) | 37 (23,3) | 72 (43,7) | 95 (59,7) | 82 (49,7) | 27 (17) |

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*Заканчэнне табліцы 3*

| Блокі | | Група | Высокі ўзровень | | Сярэдні ўзровень | | Нізкі ўзровень | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Канстатуючы этап | Выніковы этап | Канстатуючы этап | Выніковы этап | Канстатуючы этап | Выніковы этап |
| | | | абсл. (%) | абсл. (%) | абсл. (%) | абсл. (%) | абсл. (%) | абсл. (%) |
| Веданне семіятычнай выражанасці прадметнага асяроддзя | Прадметы побыту беларусаў | ЭГ | 18 (12) | 58 (38,7) | 65 (43,3) | 68 (45,3) | 67 (44,7) | 24 (16) |
| | | КГ | 8 (4,9) | 24 (15,1) | 76 (46,1) | 98 (61,6) | 81 (49) | 37 (23,3) |

Як паказаў эксперымент, найбольш цікавымі для дзяцей сталі мастацка-маўленчыя складаючыя інтэграваных заняткаў, дзе дашкольнікі маглі не толькі адлюстраваць свае ўражанні аб нацыянальнай культуры праз сімвалы, колер, іншыя сродкі выразнасці, але і з дапамогай слоў, інтанацыі, мімікі, жэстаў, дыялогавых форм паказаць свае адносіны да этнакультуры і яе каштоўнасцей, нацыянальных герояў.

Нізкі ўзровень уяўленняў дашкольнікаў аб этнічнай культуры можна растлумачыць тым, што гэта ў асноўным дзеці, якія часта хварэлі, адсутнічалі на занятках, тым самым не мелі магчымасці ў поўным аб'ёме далучыцца да культурнай спадчыны свайго народа.

Наадварот, высокі ўзровень уяўленняў старэйшых дашкольнікаў і эксперыментальных, і кантрольных груп па такім блоку, як «Народныя святы беларусаў» тлумачыцца тым, што народныя святы ў дзіцячых садах праводзіліся цэлым калектывам. На святы запрашаліся і малодшыя дашкольнікі, якія выступалі ў ролі пераемнікаў культурных традыцый дашкольных устаноў, і дзеці эксперыментальных і кантрольных груп. Акрамя таго, уся праца са старэйшымі дашкольнікамі планавалася зыходзячы з патрабаванняў нацыянальнай праграмы «Пралеска», дзе ў розных раздзелах вызначаны задачы і пэўны змест па далучэнні дзяцей да нацыянальнай гісторыі і культуры.

Параўнальны аналіз атрыманых вынікаў эксперыментальных і кантрольных груп на канстатуючым і выніковым этапах эксперымента прадстаўлены ў табліцы 4.

*Табліца 4*

**Размеркаванне дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту эксперыментальных і кантрольных груп па ўзроўнях сфарміраванасці ўяўленняў аб этнічнай культуры на канстатуючым і выніковым этапах эксперымента (%)**

| Этап | Група | Узровень | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Высокі | Добры (дастатковы) | Сярэдні | Нізкі |
| Канстатуючы | ЭГ | 0 | 13,3 | 52 | 34,7 |
| | КГ | 0 | 10,3 | 46,7 | 42,4 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Заканчэнне табліцы 4*

| Этап | Група | Узровень | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Высокі | Добры (дастатковы) | Сярэдні | Нізкі |
| Выніковы | ЭГ | 16 | 42,7 | 33,3 | 8 |
| | КГ | 0 | 30,2 | 52,2 | 17,6 |

Такім чынам, праведзенае эксперыментальнае даследаванне пацвердзіла меркаванне аб тым, што распрацаваная намі мадэль выхоўваючай прасторы этнакультурнага зместу як цэласная сістэма з'яўляецца дзейсным сродкам этнакультурнага выхавання дзіцяці ва ўмовах дашкольнай установы. Таму мы прытрымліваемся наступнай пазіцыі ў даследаванні:

- этнакультурнае выхаванне дзіцяці дашкольнага ўзросту павінна здзяйсняцца ва ўмовах, максімальна прыбліжаных да натуральных умоў яго існавання;
- спрыяльныя для этнакультурнага выхавання натуральныя ўмовы развіцця дзіцяці старэйшага дашкольнага ўзросту павінны мадэлявацца зыходзячы з выкарыстання этнічнай культуры беларусаў як сістэмы;
- пры мадэляванні выхоўваючай прасторы этнакультурнага зместу неабходна ўлічваць вопыт тэорыі і методыкі, які ўжо склаўся;
- этнакультурнае выхаванне дзяцей ва ўмовах дашкольнай установы неабходна здзяйсняць на аснове выкарыстання спецыфічных формаў і метадаў культураадпаведнага крэатыўнага характару.

## Спіс літаратуры

1. *Кахноўская, А. В.* Народныя святы, забавы, вечарыны: этнакультурнае выхаванне дашкольнікаў: зб. сцэнарыяў / А. В. Кахноўская; Мінск. абл. ін-т развіцця адукацыі. – Мінск: МАІРА, 2010. – 30 с.

2. *Кахноўская, А. В.* Культурная прастора дашкольнай установы як умова выхавання дзіцяці-дашкольніка / А. В. Кахноўская // Зборнік навуковых прац Акадэміі паслядыпломнай адукацыі / рэдкал.: А. І. Таўгень (гал. рэд.) [і інш.]; Акад. паслядыплом. адукацыі. – Мінск: АПА, 2009. – Вып. 5. – С. 109–119.

3. *Кахноўская, А. В.* Мадэляванне прадметна-прасторавага развіццёвага асяроддзя дашкольнай установы сродкамі этнакультуры / А. В. Кахноўская // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки: сб. науч. ст.: в 2 ч. / под ред. В. Ф. Беркова. – Минск: РИВШ, 2009. – Вып. 8(13), ч. 1. – С. 266–271.

4. *Кохновская, Е. В.* Сотворчество в этнокультурном воспитании / Е. В. Кохновская // Воспитание в сотворчестве (активные методы в воспитательной работе с учащейся молодежью): сб науч. ст. / под науч. ред. проф. В. В. Познякова. – Минск: РИВШ, 2010. – Вып. 2. – С. 172–176.

5. *Кахноўская, А. В.* Этнакультурнае выхаванне як педагагічная праблема / А. В. Кахноўская // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки: сб. науч. ст.: в 2 ч. / под ред. В. Ф. Беркова. – Минск: РИВШ, 2010. – Вып. 10(15), ч.1. – С. 275–281.

6. *Позняков, В. В.* Систематическое единство культуры / В. В. Позняков // Чалавек, грамадства, свет. – 2003. – № 1. – С. 80–93.

7. *Позняков, В. В.* Конструирование воспитательного пространства / В. В. Позняков // Праблемы выхавання. – 2006. – № 5. – С. 4–8.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ